# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 12 сакавіка 1998 года, чацвер, № 4 (1777)


ШУКАЮ РАБОТУ!

## Вакансіі знайшлі студэнтаў

***26 лютага ўпершыню ў Беларусі ў Белдзяржуніверсітэце адбыўся Кірмаш вакансій, які стаў першым крокам па падрыхтоўцы студэнцкай моладзі да самастойнага выхаду на рынак працы.***



30 фірмаў прапанавалі студэнтам каля 400 вакансій. Сярод працадаўцаў былі "Белдзяржстрах", "Белкантстрах", "Альвена", рэкламныя агенцтвы "Франтон", "Гударт", "Re Mark", газеты "Знамя юности", "Переходный возраст", "Белорусская строительная газета", часопіс "Познай-ка". Прадстаўнікі 597 прадпрыемстваў на Кірмашы не прысутнічалі, але інфармацыя аб тых працоўных месцах, якія яны маглі б прапанаваць, была змешчана ў бягучым радку камп'ютэра.

Кожны з 5 тысяч прысутных мог выбраць для сябе справу па душы. У асноўным працадаўцы мелі патрэбу ў рэкламных агентах, страхавых агентах, кансультантах па пытаннях прыгажосці, гандлёвых прадстаўніках. Праўда, кампанія "Stimorol", напрыклад, шукала сярод маладых і ініцыятыўных людзей дызайнера, а сродкі масавай інфармацыі — нештатных карэспандэнтаў.

Працавалі на Кірмашы і юрысты, і прафкансультанты, і псіхолагі. Апошнія, дарэчы, чамусьці не карысталіся павышаным попытам з боку студэнтаў. А нам падалося, што многім з іх якраз такія парады не пашкодзілі б.

Здаецца, за пяць гадзін, якія доўжыўся Кірмаш, многія знайшлі сабе справу па душы. Ва ўсялякім выпадку, цыдулак з нумарамі тэлефонаў і адрасамі хапіла на ўсіх. А каб пры ўладкаванні на працу і першай размове з будучым кіраўніком не ўзнікла праблем, "Беларускі універсітэт" вырашыў усё ж адукаваць асабліва саманадзейных. У наступным нумары мы надрукуем парады для пакуль што беспрацоўных. Арганізатары ж Кірмашу, спадзяемся, працягнуць гэтую карысную і цікавую справу.

*Ірына ШКЛЯР,*
*Валерыя АЎСЯНІК*

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

## "Liber-media" у БДУ. Чаму б не?

Нядаўна ў Маскве ва Усерасійскай дзяржаўнай бібліятэцы замежнай літаратуры імя М. І. Рудаміна праходзіў семінар "Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі". У ім прыняла ўдзел і дырэктар бібліятэкі БДУ Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская.

На семінары была магчымасць больш падрабязна пазнаёміцца з новымі сістэмамі кіравання бібліятэкай. У прыватнасці, разглядаўся праграмны прадукт французскай вытворчасці пад назвай "Liber-media", які ўжо працуе прыкладна ў 700 бібліятэках свету. Гэты семінар быў каштоўны яшчэ і тым, што на ім прысутнічалі спажыўцы, якія ўжо карыстаюцца гэтай праграмай і прызналі яе надзейнай.

За апошнія гады ў нашай бібліятэцы з'явілася нямала камп'ютэраў, можна карыстацца мультымедыйнымі сістэмамі, а таксама вядомай базай дадзеных Pascal, якая стала вельмі папулярнай сярод выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта — яна, акрамя інфармацыйнай насычанасці, мае яшчэ кароткія рэфераты на кожнае выданне, што вельмі зручна для працы з літаратурай. Магчыма, калі агульнауніверсітэцкая камп'ютэрная сетка злучыць бібліятэку з усімі кафедрамі і факультэтамі, працаваць стане значна прасцей.

На сённяшні дзень бібліятэка БДУ працуе ў праграме "Бібліятэка", распрацаванай у свой час Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам. Але, вядома ж, кожная праграма добрая, калі яна развіваецца і падтрымліваецца. На жаль, такой магчымасці няма. Таму бібліятэка і вымушаная шукаць новыя магчымасці праграмнага забеспячэння.

*(Заканчэнне на 2-й старонцы)*

МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА

## Атрымайце білет

***Камітэт Беларускага патрыятычнага саюза моладзі Белдзяржуніверсітэта распачаў выдачу мала-дзёжных білетаў БПСМ. Больш падрабязна расказаць пра гэта мы папрасілі сакратара камітэта БПСМ БДУ Паўла Скалабана:***

— Білет БПСМ створаны па прынцыпу шырока вядомай ва ўсім свеце студэнцкай карткі "ISIC" і мае некалькі ступеняў абароны. На адным яго баку — выява дзяржаўнага сцяга рэспублікі і тэлефон лініі дапамогі, па якому можна патэлефанаваць у цяжкай сітуацыі. На вонкавым баку — фотаздымак уладальніка білета, звесткі аб ім. Мяркуецца, што ўладальнік такога білета будзе мець невялікія скідкі на паслугі ў шэрагу арганізацыяў і прадпрыемстваў.

Атрымаць білет можна па адрасу: вул. Бабруйская, 7, пакой 304.

***Арцём ЛУК'ЯНАЎ, студэнт ІІ курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі***

ПАШТОВАЯ СКРЫНЯ

## Стыпендыі лепшым

Я б хацела расказаць пра тых хлопцаў і дзяўчат, якія дапамагаюць студэнтам засяліцца ў інтэрнат, набыць пуцёўкі ў санаторый — словам, робяць усё, каб студэнцкае жыццё было крыху лягчэй і весялей. Гэта студэнты, якія займаюцца грамадскай працай у прафсаюзным камітэце. Менавіта па іх ініцыятыве былі зроблены падарункі да 23 лютага хлапцам-інвалідам, якія навучаюцца ў БДУ.

За актыўны ўдзел у прафсаюзнай дзейнасці стыпендыю прафсаюзнага камітэта ў памеры аднаго мінімальнага заробку будуць атрымліваць на працягу паўгода старшыня прафбюро юрфака А. М. Бравусаў, член прафбюро гэтага ж факультэта А. Двойнеў, член прафбюро факультэта журналістыкі М. Дубовік, прафгрупарганізатар гістарычнага факультэта Н. Поляк, прафгрупарганізатар філалагічнага факультэта А. Азановіч, член прафбюро факультэта журналістыкі А. Сухаверхая, член прафбюро фізічнага факультэта В. Зубялевіч, член прафбюро факультэта радыёфізікі і электронікі А. Семяновіч.

Двум самым актыўным і ініцыятыўным студэнтам былі прызначаныя на паўгода стыпендыі ў памеры двух мінімальных заробкаў: старшыні прафбюро хімічнага факультэта, студэнту IV курса Аляксандру Чахоўскаму (стыпендыя Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў асветы і навукі) і старшыні прафбюро факультэта журналістыкі, студэнтцы V курса Віялеце Сілаковай (стыпендыя Мінскага абласнога аб'яднання галіновых прафсаюзаў).

Віялета паспяхова сумяшчае вучобу і працу ў прафсаюзе на працягу трох з паловай гадоў і з задавальненнем працавала б там яшчэ не адзін год. Для яе гэтая стыпендыя, якую, дарэчы, яна атрымлівае ўжо другі раз, стала выдатным падарункам напярэдадні 8 сакавіка. Аляксандр, які ўваходзіць у прафкам студэнтаў з першага курса, лічыць, што стыпендыі — добры стымул для далейшай працы.

*Марыя КАВАЛЬЧУК,*
***студэнтка факультэта журналістыкі***

КОНКУРС

## Знак Студэнцкага Саюза

У сувязі з гадавінай стварэння Студэнцкага Саюза Белдзяржуніверсітэта праводзіцца конкурс "Знак Студэнцкага Саюза Белдзяржуніверсітэта".

Усе жадаючыя могуць прыняць у ім удзел, прадставіўшы свае эскізы ва Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю (вул. Бабруйская, 7, каб. 304, тэл. 268-70-98). Для іх разгляду створана камісія на чале з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У. Б. Аджаевым.

Для ўзнагароды пераможцы конкурсу ўстаноўлена прэмія ў памеры пятнаццаці мінімальных заробкаў.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## Ва універсітэт — толькі праз выпрабаванні

***Былыя "недзяржаўныя" студэнты змогуць вучыцца ў БДУ. Праўда, толькі пасля таго, як здадуць уступныя экзамены***

***На адным з апошніх пасяджэнняў Вучонага Савета БДУ было прынята рашэнне забараніць перавод у Вядучую ВНУ рэспублікі студэнтаў з недзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў. Гэта азначае, што пасля 1 верасня бягучага года, калі закончацца пераходны перыяд, ва ўсіх, хто жадае стаць студэнтам прэстыжнай ВНУ, застанецца толькі адзін магчымы шлях — паспяхова вытрымаць уступныя экзамены. Пракаменціраваць рашэнне Вучонага Савета мы папрасілі першага прарэктара Белдзяржуніверсітэта, прафесара Пятра Іванавіча Брыгадзіна:***

— Вопыт работы ў адносінах з камерцыйнымі ВНУ,— заўважыў Пётр Іванавіч,— пераканаў нас у тым, што гэты працэс павінен быць рэгуляваным. Да гэтай высновы прыйшлі і універсітэты іншых краін СНД. Такія рашэнні ўжо прыняты ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце, Кіеўскім нацыянальным універсітэце і шэрагу іншых ВНУ.

Мы лічым, што колькасць студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю на платнай форме навучання, не павінна складаць нейкую крытычную масу, якая б уплывала на асноўную катэгорыю студэнтаў. Да таго ж, большасць універсітэцкіх абітурыентаў праходзіць праз дастаткова жорсткую сістэму адбору. Студэнтамі становяцца лепшыя з іх. А ў сістэме камерцыйных ВНУ такой канкурэнцыі няма. На наш погляд, гэта не зусім сумленна, калі нашы абітурыенты вытрымліваюць жорсткія іспыты і прыходзяць да нас на платную форму навучання праз уступныя экзамены, а былыя студэнты камерцыйных вышэйшых навучальных устаноў праходзяць пры паступленні туды, па сутнасці, толькі праз субяседванні, а потым пераходзяць ва універсітэт. Гэта далёка не роўныя ўмовы. Той, хто жадае вучыцца ў нас, павінен праходзіць праз сістэму іспытаў, устаноўленых універсітэтам. Адсюль і рашэнне, за якое Вучоны Савет універсітэта выказаўся, дарэчы, аднагалосна.

Яшчэ раз падкрэсліваю абставіны, якія паўплывалі на прыняцце гэтага рашэння. Папершае, не павінна колькасць платных студэнтаў уплываць у цэлым на арганізацыю вучэбнага працэсу. Часцей здараецца, што гэтыя навучэнцы крыху слабейшыя за тых, хто навучаецца бясплатна. Падругое, усе павінны быць у больш-менш роўных умовах. І калі чалавек ідзе ва універсітэт, значыць, свой выбар ён робіць свядома.

Забараняючы свабодны пераход студэнтаў з камерцыйных ВНУ у Белдзяржуніверсітэт, мы зусім не адмаўляем магчымасці супрацоўніцтва з імі. Трэба шукаць новыя формы адносін з тымі камерцыйнымі ВНУ, якія застануцца пасля акрэдытацыі. Гэтыя ўзаемаадносіны могуць быць пастаўлены на больш рэальную глебу пасля таго, як вы-значацца ў прынцыпе дзяржаўныя адносіны да камерцыйных ВНУ. Магчыма, мы маглі б даваць выпускнікам недзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў ступень бакалаўра. Рэальнай перспектывай магло б стаць і адкрыццё магістратуры для лепшых студэнтаў-выпускнікоў такіх ВНУ.

***Пётр ДАРАШЧОНАК, кіраўнік прэс-службы БДУ***

НОВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

# "Liber-media" у БДУ. Чаму б не?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й старонцы).*

Акрамя таго, ідзе гаворка пра тое, каб аўтаматызаваць не толькі апрацоўку літаратуры, але і камплектаванне, абслугоўванне, магчыма, увесці для кожнай кнігі штрых-код. Гэта эканоміла б час як чытачоў, так і бібліятэкараў. Дарэчы, праграма "Liber-media" дастаткова добра абараняе выдачу літаратуры.

Да таго ж, Ірына Уладзіміраўна пазнаёмілася з новымі выданнямі, якія ёсць у абменным фондзе расійскай бібліятэкі. Вядома, што не кожная расійская кніга трапляе на беларускі рынак. Таму вялікі пакунак з кнігамі дапамагаў дырэктару прывезці з Масквы Юрый Дзядзёнак — загадчык аддзела аўтаматызацыі бібліятэкі.

Дарэчы, у БДУ выкладаецца каля 990 дысцыплінаў, а спецыяльных курсаў і тэматычных накірункаў — яшчэ больш. Улічваючы такую колькасць дысцыплінаў і тое, што кніга сёння каштуе вельмі дорага, бібліятэка імкнецца набываць больш кніг у чытальныя залы. Кніжка, якая ў Маскве "старымі" расійскімі каштуе 20 тысяч, у нас з улікам курсу, падаткаў, транспартных выдаткаў — каля 200 тысячаў беларускіх рублёў. Таму сёння зусім другая тактыка камплектавання бібліятэкі літаратурай — мяняюцца нормы закупкі кніг. Больш поўна камплектуецца цэнтральная бібліятэка, а факультэцкія атрымліваюць пераважна профільныя выданні.

Не скарацілася і колькасць падпісных выданняў, зразумела ж, яны не дублююцца, як раней, але тым не менш кожны год дзякуючы рэктарату толькі на падпіску выдаткоўваецца звыш 3 мільярдаў рублёў. Акрамя таго, выдаецца зводны спіс перыядычных выданняў, якія выпісваюць бібліятэкі ВНУ. І калі якога-небудзь выдання няма ў адной бібліятэцы, ёсць магчымасць атрымаць копію ў іншых.

Цяпер многія бібліятэкі СНД з-за недахопу фінансавання значна пашырылі сервіснае абслугоўванне — платныя паслугі. Бібліятэкі рыхтуюць выставы, розныя выязныя мерапрыемствы, складаюць бібліяграфічныя спісы па індывідуальных запытах, правяраюць такія спісы, даюць кансультацыі па бібліятэчнай класіфікацыі. Існуюць розныя штрафныя санкцыі — за самавольны вынас кнігі з чытальнай залы, за нясвоечасовую здачу кнігі. За пэўную плату запісваюць у бібліятэку ўсіх ахвотных. Могуць зрабіць копіі патрэбнай літаратуры і інш. Заробленыя грошы ідуць на развіццё бібліятэкі, набываецца новая літаратура.

Дарэчы, у нашай бібліятэцы некалькі гадоў таму таксама была спроба браць невялікую плату за вынас кнігі з чытальнай залы — пераважна для таго, каб зрабіць копіі патрэбных старонак. Але такая форма не прыжылася ў БДУ. Студэнтам цяпер забаронена выносіць літарататуру з чытальнай залы, а яны таксама шукаюць выйсце: вырываюць з кніжак цэлыя старонкі. Таму бібліятэка рыхтуе прект, каб увесці шэраг платных паслуг. Проста студэнт бачыць кнігу, якая ўжо стаіць на паліцы. А вось тое, як цяжка яе дастаюць, як дорага яна каштуе, як правіла, застаецца для яго невядомым.

*Таццяна КУХАРЧУК*

ДОШКА АБ'ЯЎ

## Алімпіяда "Абітурыент Ліцэя-98"

Ліцэй Белдзяржуніверсітэта праводзіць алімпіяды па **матэматыцы, фізіцы, хіміі, гісторыі, рускай і беларускай мовах.**

Алімпіяда "Абітурыент Ліцэя-98" будзе праходзіць у два этапы. Пераможцы алімпіяды запрашаюцца для навучання ў 10 класе Ліцэя Белдзяржуніверсітэта.

Жадаючым удзельнічаць у алімпіядзе неабходна пазваніць па тэлефоне ў Мінску 221-06-01 з 12.00 да 18.00 ці прыслаць заяўку на адрас: вул. Маякоўскага, 96, каб. 100 з паметкай "Алімпіяда". У заяўцы неабходна адзначыць прозвішча, імя, горад, нумар школы. Прыём заявак заканчваецца за 2 дні да пачатку алімпіяды.

**Першы этап алімпіяды:**

◆ па матэматыцы — матэматыка (пісьмова) 4 красавіка, пачатак у 11.00 у аўд. 433 галоўнага корпуса БДУ;

◆ па фізіцы — фізіка (пісьмова) 11 красавіка, пачатак у 14.00 у аўд. 284 фізічнага корпуса БДУ;

◆ па хіміі — хімія (пісьмова) 12 красавіка, пачатак у 11.00 у Ліцэі;

◆ па гісторыі — гісторыя (пісьмовы тэст) 4 красавіка, пачатак у 12.00 у Ліцэі;

◆ па рускай мове — дыктоўка 4 красавіка, пачатак у 15.00 у Ліцэі;

◆ па беларускай мове — дыктоўка 11 красавіка, пачатак у 15.00 у Ліцэі.

*Рэгістрацыя ўдзельнікаў алімпіяды будзе праходзіць за паўтары гадзіны да пачатку пісьмовай работы. Удзельнікам алімпіяды* ***неабходна мець пры сабе*** *ручку, 20.000 рублёў (арганізацыйны ўзнос), даведку са школы з прыклеенай фотакарткай, завераную школьнай пячаткай, што прад'яўнік з'яўляецца вучнем 9-га класа.*

САКРЭТ ФІРМЫ

## INSEAD прадстаўляе

Ва Упраўленні па міжнародных сувязях ёсць інфармацыя па грамадскіх праграмах адміністрацыйнага навучання, якія прадстаўляюцца Еўрапейскім інстытутам дзелавой адміністрацыі INSEAD (Францыя). Сярод іх такія, як "Канкурэнцыя ў інфармацыйным стагоддзі", "Канкурэнтная стратэгія", "Маркетынг тэлекамунікацыяў", "Этыка ў банкаўскіх і фінансавых паслугах". Для атрымання падрабязнай інфармацыі пра любую праграму INSEAD звяртайцеся ва Упраўленне па міжнародных сувязях ці па наступных адрасах: факс 33 (01)1 60 74 55 13 альбо тэл. 33(01)1 60 72 42 90 (Janet Burdillat) альбо ў Internet па http://www.insead.fr.

## Летні інстытут

У студэнтаў з'явілася магчымасць прыняць удзел у дзейнасці летняга Амерыканскага інстытута па вывучэнню палітычных і эканамічных сістэмаў.

Інстытут будзе працаваць у Празе з 11 ліпеня па 2 жніўня 1998 года. Гэты праект фінансуецца Фондам амерыканскіх даследаванняў пры ўдзеле Карлаўскага (Прага) і Джорджтаўнскага (Вашынгтон) універсітэтаў. Студэнты, якія пройдуць конкурс, забяспечваюцца стыпендыяй. Кошт праезду аплочваецца самімі ўдзельнікамі. Падчас адбору перавага аддаецца студэнтам, якія валодаюць англійскай мовай на ўзроўні праграмы TOEEL 600 і вышэй, вучацца на трэцім, чацвёртым ці пятым курсе, маюць высокія паказчыкі ў вучобе, узнагароды за ўдзел у студэнцкіх навуковых конкурсах і канферэнцыях, актыўна удзельнічаюць у грамадскім студэнцкім жыцці. Апошні тэрмін падачы заяваў — 31 сакавіка 1998 года на адрас:

*The Fund for American Studies*
*18 th St., NW*
*Washington, DC 20036, USA*
*tel: 202 986-0384*
*fax: 202 986-0390*

## Вучоба для прафесараў

18 прафесараў універсітэта могуць паўдзельнічаць у летняй праграме "Станаўленне замежнай палітыкі ў ЗША" ва універсітэце штата Мічыган з 20 чэрвеня па 1 жніўня 1998 года.

Выдаткі на харчаванне, экскурсіі, медыцынскую страхоўку аплочвае амерыканскі бок. У праграме — наведванне бібліятэкі Кангрэса ЗША і праца ў ёй. Дакументы неабходна падрыхтаваць да 16 сакавіка.

ЕЎРОПА... ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

# Калі "Еўра" будзе ў нашых кішэнях?

***Мы прапануем увазе чытачоў "Беларускага універсітэта" працяг артыкула, надрукаванага пад гэтым жа загалоўкам у нумары газеты за 26 лютага 1998 года.***

### Этапы, якія вядуць да Еўра

**1 ліпеня 1990 года**

Пачатак першага этапа эканамічнага і валютнага саюза. Поўная лібералізацыя перамяшчэння капіталаў у дзяржавах-членах ЕС (за выключэннем тых выпадкаў, у якіх былі дазволены часовыя адхіленні).

**1 студзеня 1993 года**

Стварэнне адзінага рынку.

**1 лістапада 1993 года**

√ Замарожаны склад карзіны экю.

√ Дагавор аб Еўрапейскім Саюзе набывае моц. Пачатак другога этапу ЭВС.

**15 і 16 снежня 1995 года**

√ Еўрапейскі Савет у Мадрыдзе.

√ Назва «Еўра» прымаецца для адзінай валюты.

√ Вызначаюцца тэхнічныя працэдуры для ўвядзення Еўра і часовы расклад для пераходу на адзіную валюту (завяршэнне працэсу запланавана на 2002 год).

**Не пазней 31 снежня 1996 года**

√ ЕВІ удакладняе нарматыўную, арганізацыйную і адміністрацыйную аснову для Еўрапейскага цэнтральнага банка (ЕЦБ) і Еўрапейскай сістэмы цэнтральных банкаў (ЕСЦБ).

√ Камісія, Савет і ЕВІ рыхтуюць заканадаўства па ЕЦБ, ЕСЦБ і па адзінай валюце.

**1 студзеня 1999 года**

√ Пачатак трэцяга этапа ЭВС. Савет безадзыўна зацвярджае курсы канвертацыі для валютаў краінаў-удзельніцаў як паміж сабой, так і адносна Еўра.

√ Еўра становіцца самастойнай валютай, і афіцыйны кошык экю закрываецца.

√ Уступленне ў сілу рэгламенту Савета па прававой аснове для ўвядзення Еўра.

**З 1 студзеня 1999 года**

√ ЕСЦБ фармулюе і ажыццяўляе валютную палітыку, а таксама абменныя аперацыі з замежнай валютай у Еўра.

√ Дзяржавы-члены выпускаюць новыя каштоўныя паперы ў Еўра.

**1 студзеня 1994 года**

У Франкфурце адкрываецца Еўрапейскі валютны інстытут (ЕВІ)

√ Узмацненне працэдураў па каардынацыі эканамічнай палітыкі на еўрапейскім узроўні.

√ Дзяржавы-члены пачынаюць барацьбу супраць празмернага «бюджэтнага дэфіцыту» для дасягнення эканамічнай канвергенцыі.

**31 мая 1995 года**

Камісія прымае «зялёны даклад» па адзінай валюце (прыкладныя працэдуры для пераходу да адзінай валюты)

**У пачатку 1998 года**

Кіраўнікі дзяржаваў і урадаў будуць вырашаць, якія дзяржавы-члены змогуць першымі ўдзельнічаць у праграме адзінай валюты на падставе крытэрыяў канвергенцыі з улікам эканамічных дадзеных за 1997 год.

**Як мага хутчэй пасля гэтага рашэння**

√ Дзяржавы-члены прызначаюць Выканаўчае праўленне ЕЦБ.

√ ЕЦБ і Савет вызначаюць дату ўвядзення банкнотаў і манетаў Еўра.

√ ЕСЦБ пачынае выпуск банкнотаў Еўра.

√ Савет і дзяржавы-члены пачынаюць выпуск манетаў Еўра.

**Да 1 студзеня 1999 года**

Фінальная падрыхтоўка ЕЦБ і ЕСЦБ:

√ Савет прымае заканадаўства па прынцыпах падпіскі на капіталы, зборы статыстычнай інфармацыі, мінімальных рэзервах, кансультацыях з ЕЦБ, штрафах і санкцыях, якія могуць быць спагнаныя з прадпрыемстваў.

√ ЕЦБ і ЕСЦБ рыхтуюцца пачаць дзейнасць: адкрыццё ЕЦБ, прыняцце нарматыўных дакументаў, выпрабаванне працэдураў валютнай палітыкі і г.д.

**З 1 студзеня 1999 года і не пазней 1 студзеня 2002 года**

√ ЕСЦБ абменьвае валюту па безадзыўна зацверджаных курсах канвертацыі.

√ ЕСЦБ і адпаведныя ўлады дзяржаваў-членаў аналізуюць працэс пераходу ў банкаўскіх і фінансавых сектарах, а таксама дапамагаюць эканоміцы ў цэлым падрыхтавацца да пераходу.

**Не пазней 1 студзеня 2002 года**

√ ЕСЦБ паступова ўводзіць ў абарачэнне банкноты Еўра і выводзіць нацыянальныя банкноты.

√ Дзяржавы-члены паступова ўводзяць ў абарачэнне манеты Еўра і выводзяць нацыянальныя манеты. ...Працэс завяршаецца...

**Не пазней 1 ліпеня 2002 года**

√ Пераход да Еўра завяршаецца ва ўсіх краінах-удзельніках.

**У якіх сферах краіны, якія жадаюць далучыцца да Еўра, павінны павялічыць намаганні, каб выканаць устаноўленыя крытэрыі?**

Дзяржавы-члены дасягнулі рэальнага прагрэсу на шляху да эканамічнай канвергенцыі, але ўрадавы дэфіцыт з'яўляецца занадта вялікім. Што датычыцца іншых крытэрыяў канвергенцыі, то за апошнія гады сітуацыя значна палепшылася, асабліва па інфляцыі, што зафіксаваная на рэкордна нізкім узроўні (3.1% для Саюза ў цэлым у 1995 годзе), і па доўгатэрміновых працэнтных стаўках.

**Ці з'яўляецца скарачэнне дэфіцыту сумяшчальным з барацьбой супраць беспрацоўя?**

Скарачэнне дэфіцыту — адзіны магчымы шлях да забеспячэння фундаменту для здаровага эканамічнага росту, які з'яўляецца неабходнай умовай для стварэння працоўных месцаў і барацьбы з беспрацоўем ў Еўропе.

Эканамісты пагаджаюцца, што з улікам глабалізацыі эканомікі павелічэнне ўрадавага дэфіцыту ўжо болей не можа лічыцца дзейсным спосабам спрыяння эканамічнай актыўнасці. Наадварот, аналіз эканамічнай дзейнасці еўрапейскіх краінаў за апошнія 25 гадоў сведчыць, што ўзровень беспрацоўя падае — часам нават рэзка — у краінах, якія скарацілі бюджэтны дэфіцыт, як гэта было, напрыклад, у Даніі з 1982 па 1986 гады альбо ў Ірландыі на працягу апошняй дэкады.

Адпаведна, праблема беспрацоўя пагаршаецца, калі краіны больш далёка ідуць за чырвоную рысу. 15 дзяржаваў-членаў Саюза адназначна зразумелі гэты ўрок: еўрапейская стратэгія па забяспячэнню працоўных месцаў, прынятая на Еўрапейскім Савеце ў Мадрыдзе, надае найбольшы прыярытэт скарачэнню празмернага дэфіцыту.

**Ці будзе поўны эканамічны і валютны саюз азначаць, што мая краіна страціла права праводзіць уласную эканамічную палітыку?**

Так і не. Так, таму што на самой справе нацыянальныя ўрады пагадзіліся перадаць частку функцыяў па кантролю над іх эканомікамі, для таго каб атрымаць іншыя перавагі. У гэтым сутнасць пытання. Перавагі поўнага ЭВС для спажыўцоў і бізнесу адзначаныя вышэй; перавагі для нацыянальных урадаў і іх цэнтральных банкаў альбо аналагічных структураў таксама вельмі вялікія.

Пераход да адзінай валюты дазволіць дзяржавам-членам мець большы ўплыў на эканамічную палітыку іншых, а таксама на змены працэнтных ставак. Меншыя краіны будуць мець больш магчымасцяў у параўнанні з вялікімі краінамі рэгуляваць эканоміку, таму што кожная дзяржава будзе мець адзін голас пры прыняцці рашэнняў валютнай палітыкі ў Еўрапейскім цэнтральным банку.

Адзіная валюта дазволіць больш упэўнена стрымліваць ціск на асобныя нацыянальныя валюты з боку спекулянтаў. Нечаканыя дэвальвацыі адыйдуць у мінулае. Гэта таксама паспрыяе прадказальнасці ў працэнтных стаўках. Больш таго, нежаданне далучыцца да адзінай валюты пазбавіць нацыянальны ўрад магчымасці ўдзельнічаць ў арганізацыі работы Еўрапейскага цэнтральнага банка, і такім чынам, у адпаведнай ступені, у забеспячэнні прагрэсу самой Супольнасці.

*(Заканчэнне будзе)*

*Інфармацыя падрыхтаваная Цэнтрам Еўрапейскай дакументацыі і інфармацыі, які размяшчаецца ў пакоі 112 галоўнага корпуса, тэл.220-65-38. Друкуецца паводле выдання "European Commission. Europe... Questions and Answers. When will the "Euro" be in our pockets?" Бюро афіцыйных публікацыяў Еўрапейскіх супольнасцяў*

*Шкада, што 8 сакавіка прыпала ў гэтым годзе на нядзелю, а выхад нумара газеты быў, як заўсёды, запланаваны на чацвер. Таму пра жанчын універсітэта мы расказваем крыху са спазненнем, прытрымліваючыся старажытнага прынцыпу: лепей позна, чым ніколі. Расказаць пра ўсіх самых-самых (кожная з нашых чытачак можа дадаць да гэтага найдольш прывабны, на яе думку, эпітэт) — задача невырашальная. Мы выбралі дзвюх. Дырэктар бібліятэкі Ірына Уладзіміраўна Арахоўская працуе ва універсітэце не адно дзесяцігоддзе. Студэнтка Вікторыя Мартыненка вучыцца тут толькі чацвёрты год. Яднае іх не агульнае месца працы і вучобы, а адносіны да месца жанчыны ў грамадстве: Ірына Уладзіміраўна ўзначальвае адно з самых непрадказальных падраздзяленняў, Вікторыя паспрабавала стаць часткай самага што ні на ёсць мужчынскага калектыву — ваеннай кафедры.*

**А ВЫ ЗМАГЛІ Б?**

# Вікторыя — разбуральніца традыцыяў

*Вікторыя Мартыненка — адзіная студэнтка, якая навучаецца на ваеннай кафедры БДУ. Так атрымалася не таму, што ёй надта ўжо захацелася пераадолець мяжу паміж месцам у жыцці мужчыны і жанчыны. Проста танклявая і вельмі жаноцкая знешне Вікторыя не лічыць службу ў войску мужчынскай прывілеяй. У прадстаўніцаў цудоўнай паловы чалавецтва, на яе думку, гэта атрымліваецца нікольні не горш...*

**— Мне здаецца, не было яшчэ ва універсітэце такіх прэцэдэнтаў, каб дзяўчаты наведвалі ваенную кафедру...**

— Проста мяне гэта вельмі зацікавіла. Да таго ж, дзед мой быў кадравым вайскоўцам, а я адзіная дачка ў сям'і. Я вырашыла, што абарона Айчыны — гэта ўсё ж такі вельмі высакародная справа. Дый цікава было адчуць клімат мужчынскага калектыву, хаця гэта не было самамэтай. Потым хацелася яшчэ даведацца, як успрымуць маё рашэнне хлопцы. Усё ж такі паспрабаваць сябе ў традыцыйна мужчынскай справе даводзіцца не кожнай дзяўчыне. Клімат мужчынскай кампаніі вельмі спецыфічны. Дзяўчыне ў ёй псіхалагічна цяжка, бо мужчынская атмасфера вельмі сур'ёзная. Нават я, павучыўшыся на ваеннай кафедры, не толькі адчула гэта, але і сама стала інакш успрымаць рэчаіснасць.

**— Цябе адразу прынялі ў калектыў ці давялося даказваць, што дзяўчыне "ваенка" не менш неабходна, чым хлопцам?**

— На кафедры да мяне, дарэчы, вельмі добра ставяцца. Калі я звярнулася са сваёй просьбай, мяне падтрымалі, але высветлілася, што патрэбна яшчэ мець дазвол ад рэктара і міністра абароны. Мне пашанцавала: на прыёме ў былога міністра я таксама сустрэла падтрымку.

**— І кім ты будзеш пасля заканчэння вучобы на ваеннай кафедры?**

— Па спецыяльнасці, якую я атрымліваю, — ваенным псіхолагам. Але калі мне выпадзе такі гонар, то я, пэўна, буду служыць ва Узброеных Сілах.

**— А якая ў цябе грамадзянская спецыяльнасць?**

— Культуралогія. Таксама цікава.

**— Якія дысцыпліны ты вывучаеш на "ваенцы"?**

— Перш за ўсё ваенную псіхалогію. У нас вельмі добры выкладчык — псіхолаг Конанаў. А таксама методыку дыягностыкі, тактыку, хімічную абарону, страявую. Была неяк палявая практыка, якая аказала, напрыклад, на мяне невыказнае ўражанне. Па-першае, нас апранулі ў форму. У ёй людзі заўсёды мяняюцца. Па-другое, капалі акопы — стоячы, лежачы, хадзілі ў атаку, кідалі гранаты. Мужчынскія гульні вельмі цікавыя. У гэтым сэнсе мужчыны жывуць больш цікава. Я думаю, што кожнай дзяўчыне спадабалася б на маім месцы. Хлопцы ж успрымаюць мяне як свайго чалавека.

**— Як, дарэчы, паставіліся да твайго выбару сяброўкі?**

— Спачатку яны не паверылі і не чакалі. А потым я зразумела, што многія з іх хацелі б зрабіць тое ж самае. І я думаю, што сярод маіх аднакурсніцаў шмат разумных, моцных дзяўчат, якія паспяхова авалодвалі б вайсковай спецыяльнасцю. Проста яны не задумваліся, што традыцыю можна часам ламаць.

**— А фізічна табе не цяжка дужацца з мужчынамі?**

— Зразумела, цяжка. У мяне тыя ж нарматывы. Але ёсць палёгка з боку выкладчыкаў. Зразумела, і хлопцы дапамагаюць. Падчас палявой практыкі яны амаль што аўтамат мне неслі, таму што была я зусім знясіленая. А калі капалі акопы, раз-пораз цікавіліся: ну, як там? У вайскоўцаў, як мне здаецца, павінна быць рыцарскае стаўленне да жанчыны. На ваеннай кафедры выкладчыкамі гэта закладаецца. Хлопцы на ваеннай кафедры і ў жыцці розныя ў стасунку да жанчыны. Войска ўвогуле многа дае: з хлопца вырастае мужчына. Толькі адарваўшыся ад дома, хлопцы, відаць, і спасцігаюць, што такое маці. Зараз шмат гавораць пра тое, што надыходзіць жаночая эра. Жанчыны мусяць перамагчы і традыцыі, і нават мужчынскі цынізм. Але да ваеннай кафедры такая характарыстыка не мае дачынення.

**— Ты марыш аб службе ва Узброеных Сілах, а каб трапіць у войска, таксама патрэбна атрымліваць міністэрскі дазвол?**

— Мне здаецца, што перашкодаў больш не будзе. Галоўная загваздка заключалася ў тым, каб атрымаць званне лейтэнанта, а астатняга ўжо можна дасягаць нароўні з мужчынамі. Ваенны псіхолаг — вельмі цікавая спецыяльнасць. Валодаючы ёю, нават у самай далёкай кропцы можна знайсці вельмі цікавую работу. Я нават думаю, што жанчыне як ваеннаму псіхолагу больш адпавядае адчуваць людзей і інтуітыўна знаходзіць самую патрэбную параду. Мне здаецца, што мужчыне зрабіць гэта больш складана.

**— А як паставіліся да твайго выбару бацькі?**

— Мама нават параіла мне зрабіць гэта. Бацьку гэта спадабалася куды менш. Яму хацелася, каб дачка займалася жаночымі справамі. Так што падтрымлівала мяне мама.

**— Ці можаш ты дазволіць сабе насіць на заняткі на ваеннай кафедры кароткую спадніцу?**

— Гэта не зусім зручна. Таму я аддаю перавагу джынсам.

**— А ваенная форма?**

— Нам выдавалі ў часовае карыстанне толькі палявую. Парадную, магчыма, атрымаем пасля збораў у дзейных частках пасля прыняцця прысягі.

*Марына Аверкіна*

**СЛУЖБОВЫ РАМАН**

# Жаночая дзяржава

*Адзін з самых вялікіх жаночых калектываў універсітэта працуе ў бібліятэцы. Кіруе гэтым унікальным калектывам таксама прадстаўніца прыгожай паловы чалавецтва. Як удаецца дырэктару бібліятэкі Ірыне Уладзіміраўне Арахоўскай спраўляцца з такой колькасцю жанчын: трымаць парадак і добразычлівую атмасферу, заўсёды цудоўна выглядаць і быць прыкладам ва ўсім не толькі для сваіх падначаленых? Пра гэта карэспандэнт "Беларускага універсітэта" і гутарыць з ёй.*

**— Ірына Уладзіміраўна, у вас сапраўды унікальны калектыў — амаль адны жанчыны. Пэўна, нешматлікім прадстаўнікам моцнага полу ў такім асяроддзі даводзіцца несалодка...**

— Толькі 3 мужчыны працуе ў бібліятэцы, а жанчын амаль 130. Зразумела, знайсці добрага праграміста на зарплату бібліятэкара амаль нерэальна. Таму я вырашыла пашукаць такога чалавека сярод студэнтаў. І знайшла — на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Але, па праўдзе, у мяне заўсёды галаўны боль — каго я бяру на працу. Пачала даведвацца, што за хлопец. Прыехаў ён з-пад Масквы з ваеннага вучылішча. За летнія канікулы даздаў розніцу ў экзаменах — прычым без адзінай чацвёркі. Мне ён адразу спадабаўся — высокі, стройны, бландзін. Спытала ў яго, чаму ён кінуў вучылішча. А ён адказвае: па неадпаведнасці. Аказалася, што ў вучылішчы ўсе экзамены здаваў датэрмінова. А быў парадак — здаў ці не, усё роўна павінен хадзіць з усімі курсантамі на лекцыі. Ён жа імкнуўся ісці наперад. Я ўсё дапытвалася: ці не хуліганіў ён, ці не любіць выпіць? Разумееце, я ж брала праграміста ў жаночы калектыў. А сама думаю — хлопец прыгожы, а дзяўчат незамужніх у нас шмат. Нейкі час вагалася. Але з ім мне пашанцавала. Дый жонку ён знайшоў сабе за сценамі бібліятэкі, хаця тут многія звярталі на яго ўвагу.

А вось з другім праграмістам былі пэўныя клопаты. Ён таксама пайшоў з вучылішча па неадпаведнасці. Завочна вучыўся ў радыётэхнічным інстытуце. Хлопец прыгожы і талковы. Але прыходзілася выклікаць да сябе ў кабінет і гутарыць пра тое, каб не заляцаўся да нашых дзяўчат. Я прытрымліваюся старых традыцыяў — і, па праўдзе, грамадзянскіх шлюбаў не ўхваляю...

Магчыма, мне не трэба звяртаць на гэта ўвагу. Але я стаўлюся да сваіх жанчын па-добраму. І перажываю за іх.

**— А вашы супрацоўніцы, забыўшыся на тое, што вы — дырэктар, могуць даверыцца вам проста як жанчыне, якая іх зразумее?**

— Мы сапраўды як адна сям'я: шчасце ў чалавека — радуемся разам, гора — таксама падтрымліваем адзін аднаго. Нарадзілася ў каго-небудзь дзіця — падзея.

Канешне, жанчыны ўсе розныя. Бываюць выпадкі, калі хто-небудзь і зласловіць. Дарэчы, я гэта хутка вылічаю. Але нягледзячы ні на што калектыў у нас цудоўны.

Заўсёды заўважаю і радуюся, калі мае жанчыны купляюць сабе новыя сукенкі. А бывае і так. Сяджу я ў сваім кабінеце, а дзверы то адчыняцца, то зачыняцца. І так праз кожную хвіліну. Аказваецца, прайшла па бібліятэцы чутка, што дырэктар прыйшла на працу ў новым убранні. Ім жа проста хочацца паглядзець, як я ў ім выглядаю.

У нас тут своеасаблівая дзяржава ў дзяржаве. Я пра сваіх супрацоўнікаў усё ведаю. І яны давяраюць мне. Расказваюць пра свае сямейныя праблемы і радасці. Памятаю адну даўнюю гісторыю. Да мяне прыйшла жанчына і сказала, што ёй здрадзіў муж. І мы прыдумалі з ёй, як яго праверыць. І я дапамагла ёй гэта зрабіць. Гэтая сям'я, дарэчы, не распалася, але муж быў навучаны. Падобных жыццёвых сітуацыяў у бібліятэцы было шмат. Напрыклад, часам дзяўчаты сябруюць і абслугоўваюць аднаго і таго ж чытача. У выніку кахаюць яго абедзве. А перамагае хітрэйшая.

Аднойчы быў выпадак, калі дзяўчына сабралася кідаць універсітэт на апошнім курсе з-за таго, што сяброўка адбіла ў яе кавалера. Уявіце сабе яе стан. Важна было прымусіць яе здаваць экзамены. Гэта было вельмі складана. Давялося нават аднойчы вярнуцца дадому пазней, чым звычайна. Экзамен быў увечары. А мне трэба было запэўніцца, што яна адчыніць дзверы і зойдзе ў аўдыторыю. Яна здала ўсе экзамены. Цяпер ў яе ўсё добра. І я была шчыра радая, калі праз год пасля ўсяго гэтага яна запрасіла мяне на сваё вяселле...

**— Ірына Уладзіміраўна, а Вы можаце назваць сябе шчаслівым чалавекам?**

— Я шчаслівы чалавек. Хаця калісьці згубіла дарагога мне сябра. Першае каханне... Мой хлопец займаўся ў вышэйшым ваенна-марскім вучылішчы і загінуў на манёўрах. Так атрымалася. Думала, што я аднагалюб і ніколі не выйду замуж. Але, хоць і значна пазней, гэта адбылося. У мяне добры ўважлівы муж, дзве дачкі, унукі... Я шчаслівы чалавек, таму што мне заўсёды шанцавала на цудоўных людзей.

*Гутарыла*
*Таццяна КУХАРЧУК*

**А Ў НАС! А Ў ВАС?**

# Дыпламаты ў гасцях у будучых калег

Студэнтам заўсёды цікава сустрэцца з лепшымі прадстаўнікамі той прафесіі, якую яны спасцігаюць у вышэйшай навучальнай установе. 24 лютага такую магчымасць атрымалі дзяўчаты і юнакі, што праходзяць навучанне на факультэце міжнародных адносін БДУ. Падрыхтавала гэтае мерапрыемства арганізацыя БПСМ факультэта. З будучымі спецыялістамі ў галіне дыпламатыі, сусветнай эканомікі, міжнароднага турызму сустрэліся начальнік Упраўлення міжнародных арганізацыяў Міністэрства замежных спраў нашай дзяржавы Юрый Аранж, загадчык аддзела МАГАТЭ Карэн Акопаў, трэці сакратар міністэрства, памочнік намесніка міністра замежных спраў Іван Грыневіч. Дарэчы, двое апошнія — былыя выпускнікі факультэта міжнародных адносін.

Паўтары гадзіны найцікавейшай размовы прысвячаліся асвятленню дзейнасці нашай краіны ў галоўных органах ААН у апошнія гады, праблемам зніжэння аплаты за ўдзел Рэспублікі Беларусь у рабоце гэтай арганізацыі ды іншым пытанням. Спадар Акопаў катэгарычна абвергнуў домыслы некаторых журналістаў аб магчымасці стварэння нашай дзяржавай уласнай ядзернай зброі. Госці сустрэчы таксама адказалі на шматлікія пытанні цікаўных слухачоў, віталі сваіх былых настаўнікаў — выкладчыкаў факультэта міжнародных адносін.

*Леанід ФЯДОТАЎ, сакратар камітэта БПСМ факультэта міжнародных адносін БДУ*

**ПАСПРАБУЙЦЕ!**

# Стыпендыя Гётэ

**Прыемная навіна для тых аспірантаў і дактарантаў, якія выдатна валодаюць нямецкай мовай, прыйшла ва універсіэт: прэм'ер-міністр зямлі Цюрынгія заснаваў на 1998 год стыпендыю імя Гётэ.**

**На ўдзел у конкурсе маюць права аспіранты і дактаранты з ВНУ Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, якія займаюцца навуковымі даследаваннямі ў галіне літаратуры, музыкі, мастацтва і гісторыі культуры Германіі. Праўда, навуковыя работы павінны мець непасрэднае дачыненне да зямлі Цюрынгіі ды яе сувязяў з Еўропай.**

**Перавага будзе аддавацца тым, каму споўнілася не больш за 35 гадоў. Пераможцаў адбірае сфарміраванае дзяржаўнай канцылярыяй Цюрынгіі журы. Апошні тэрмін падачы заявак на ўдзел — 30 чэрвеня 1998 года.**

**Стыпендыяты будуць праводзіць навуковыя даследаванні ў адной з навучальных установаў Цюрынгіі тэрмінам не менш за 3 месяцы, для чаго будуць выдзяляцца неабходныя сродкі. Штомесячна стыпендыятам выплочваецца стыпендыя ў памеры ад 2000 нямецкіх марак. Стыпендыят самастойна аплочвае транспартныя выдаткі, выдаткі па медыцынскаму страхаванню.**

*Ірына ШКЛЯР*

**ДАІ ПАВЕДАМЛЯЕ**

# Інспекцыя заўсёды ставіцца прыязна

За два месяцы 1998 года супрацоўнікі ДАІ Маскоўскага раёна выявілі 14036 парушэнняў Правілаў дарожнага руху.

Цяперашнія пагодныя ўмовы патрабуюць ад вадзіцеляў пастаяннай увагі, арыентавання ў канкрэтнай дарожнай сітуацыі. Пра гэта многія забываюць. Напрыклад, вадзіцель А. І. Дзеравяга, кіруючы няспраўнай машынай у стане алкагольнага ап'янення, пры заездзе ў браму (шырынёй 6,25 м) наехаў заднім колам на пешахода Л. Ц. Рыжкову. Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў яна сканала на месцы.

Аднак не толькі вадзіцелі парушаюць ПДР. Грашаць гэтым і пешаходы. За два месяцы гэтага года выяўлена 4957 парушэнняў дарожнага руху, дапушчаных пешаходамі.

Дарога патрабуе строгай дысцыпліны. Не парушайце правілы дарожнага руху, і ДАІ заўжды будзе ставіцца да вас прыязна.

*М. СКІПАР, дзяржаўтаінспектар Маскоўскага ДАІ*

СУСТРЭЧЫ

## Kettler у кожны інтэрнат

На факультэце журналістыкі адбылася сустрэча студэнтаў з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімірам Барысавічам Аджаевым. Асноўнай тэмай было далучэнне студэнтаў да арганізацыйнай і грамадскай дзейнасці ва універсітэце.

Пасля навучання, у вольны час, застаецца згублены, нікому не патрэбны студэнт. Па меркаванню Уладзіміра Барысавіча, менавіта ў такі момант прыходзіць на дапамогу студэнцкі актыў. У моладзі тым часам з'яўляецца магчымасць выказаць сваё меркаванні, адстаяць іх.

Прарэктар абнадзеіў студэнтаў паведамленнем аб хуткім адкрыцці новага інтэрната. Мяркуючы па ўсім, гэты будынак будзе адпавядаць патрабаванням сучаснай архітэктуры і камфорту. Асабліва спадабаліся прысутным словы пра блочную сістэму і тое, што ў кожным блоку будзе свая кухня.

Акрамя таго, прыемна ўразіла навіна аб ужо закупленым для інтэрнатаў абсталяванні Kettler.

*Валерыя АЎСЯНІК*

МУЗЫЧНЫ РЫНГ

## Джаз — не культурызм вушэй

***Міжнародны джазавы фестываль "Мінск-98" стабільна прапісаўся ў беларускай сталіцы. Сёлета ён пяты па ліку і прысвечаны стогадоваму юбілею вялікага джазавага кампазітара Джорджа Гершвіна.***

На прэс-канферэнцыі на пачатку фэста маэстра Фінберг падкрэсліў: "На тэрыторыі СНД джазавыя фестывалі праводзяцца толькі ў Маскве, Санкт-Пецярбургу і Мінску..."

Свята доўжылася чатыры дні. Падарункам гледачам ад музыкантаў былі пяць канцэртаў. Кожны дзень зала была не проста поўнай — яблыку не было дзе ўпасці. Людзі стаялі ў праходах, падпіраючы сценкі клуба імя Дзяржынскага, дзе праводзіўся фестываль. Адразу было відаць: мінчане, якія стаміліся ад маскультуры, адчувалі джазавы голад і прагу да сапраўднага жывога гука.

Першы дзень фестываль быў распачаты біг-бэндам Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. У канцэртную праграму аркестра гарманічна ўлілася вакальная група з Наваполацка "Аніма-квартэт" (мастацкі кіраўнік Святлана Трушына).



Другі дзень адкрыў новыя імёны — дзіцячы джаз-ансамбль Пятра Пятрухіна з Масквы. Самаму малодшаму ўдзельніку ансамбля Вадзіму Антонаву — 12 гадоў. Трубачу Пятру Пятрухіну, найстарэйшаму, — 17.

Ансамбль "Яблочный чай" пад кіраўніцтвам Ігара Сацэвіча не падладжваўся пад публіку, прапаноўваючы ёй старую добрую класіку.

Трэці дзень быў прысвечаны вакальнаму джазу. Тут выступаў вядомы Анатоль Крол (Масква) з канцэртнай праграмай "Лэдзі расійскага джазу". І тады ж адбыўся яшчэ адзін канцэрт — "Джаз апоўначы".

Апошні дзень фестываля завяршыўся выступленнямі джаз-трыа Аркадзя Эскіна і джаз-групы Сяргея Аляксандрава.

*Дыяна БАЛЫКА*

СПОРТПЛЯЦОЎКА

## "Залатыя" хлопцы

Гіравікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта па-ранейшаму застаюцца мацнейшымі ў сталіцы Беларусі. На апошнім чэмпіянаце горада, што праходзіў у першы веснавы дзень, нашыя хлопцы не толькі заваявалі першае месца ў агульнакамандных спаборніцтвах (абагнаўшы каманды АТ "Атлант" і Ваеннай акадэміі Беларусі), але і сабралі пяць залатых медалёў з васьмі магчымых. "Залатымі" сталі ў вазе 60 кг кандыдат у майстры спорту Андрэй Стальмашонак (I курс фізфака), у вазе 70 кг майстар спорту Дзмітрый Бархан (III курс ФПМІ), у вазе 80 кг майстар спорту Аляксандр Воўк (I курс юрфака), у вазе 90 кг майстар спорту Алег Сямёнаў (V курс гістфака) і ў вазе звыш 100 кг кандыдат у майстры спорту Андрэй Атрашкевіч (III курс ФМА). Сярод хлопцаў, што важылі да 65 кг, першынстваваў студэнт Акадэміі фізвыхавання і спорту майстар спорту Сяргей Казлоўскі, у вазе да 75 кг перамог рабочы "Атланта" майстар спорту Юрый Байрамаў і ў вазе 100 кг святкаваў перамогу дынамавец кандыдат у майстры спорту Мікола Сямёнаў.

Трэнеры каманды гіравікоў БДУ былі задаволеныя выступленнем сваіх выхаванцаў. Але часу для адпачынку няма. Ужо 14 і 15 сакавіка нашых атлетаў чакаюць спаборніцтвы сярод ВНУ.

## Ставіць рэкорды ніколі не позна

Віктар Фёдаравіч Кавалёў — чалавек з даволі цікавым лёсам. У юнацтве пачынаў працаваць з бацькам у кузні, але хутка "захварэў" цяжкай атлетыкай і, скончыўшы інстытут фізічнай культуры, у 1955 годзе прыйшоў на кафедру фізвыхавання Белдзяржуніверсітэта. Зараз яму 70, але па сённяшні дзень ён не развітваецца са штангай. А на бліжэйшым чэмпіянаце Еўропы сярод ветэранаў спадзяецца пабіць сусветны рэкорд:

— Я толькі перайшоў у апошнюю ўзроставую групу, дзе аб'яднаныя спартсмены ад 70 гадоў і старэйшыя. Там трэба "талкнуць" кілаграмаў 100 і зрабіць "рывок" 75 кілаграмаў. Гэта тая вага, якую я амаль адолеў.

— Віктар Фёдаравіч, Вы столькі гадоў падымаеце штангу, яна Вам не надакучыла?

— Ні ў якім разе. Прага да перамогі прымушае зноў і зноў выходзіць на памост. Наогул спорт — гэта заўсёды імкненне да чагосьці яшчэ не дасягнутага. Не магу зразумець тых, хто пакінуўшы вялікі спорт, закідвае спартыўныя заняткі наогул. Бо калі ты трэніруешся, то не толькі падтрымліваеш форму, але і пачынаеш адчуваць сябе чалавекам, развіваешся як асоба. Шмат хто са спартсменаў скардзіцца, што ў яго ўсё баліць. Але гэта не ад узросту — ад нетрэніраванасці.

— Напэўна, ніводнае спаборніцтва не абыходзіцца без кур'ёзаў...

— Здараецца. Аднойчы мы жылі ў жаночым манастыры. Наша каманда выступала ў Аўстрыі. Ехалі амаль што за свае грошы, таму вялікіх сродкаў не мелі. І беларуская епархія папрасіла кіраўніцтва манастыра выдзяліць нам прытулак.

— Вы ўжо каторы год перадаяце свой вопыт студэнтам БДУ...

— За сваё жыццё я выхаваў 47 майстроў спорту і 5 майстроў спорту міжнароднага класа. У мяне займаўся Віктар Міхайлавіч Анішчык, цяперашні дэкан фізфака, дэкан гістфака Алег Анатольевіч Яноўскі, былы дэкан журфака Алег Георгіевіч Слука. Ды яшчэ шмат хто. Усіх не пералічыш. А двое, Уладзімір Сяргеевіч Фралоў і Віктар Паўлавіч Сідарук, зараз працуюць побач са мною. Заўсёды вучыў сваіх выхаванцаў добра ставіцца да чалавека, удзымаць настрой сабе і іншым. Бо, лічу, што не ў здаровым целе здаровы дух, а менавіта здаровы дух стварае здаровае цела.

## І супрацоўнікі лепшыя

Напрыканцы лютага пачалося 27-е першынства сярод працоўных калектываў Маскоўскага раёна.

Спачатку высвятлялі адносіны шахматысты. У сямі турах супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта, згубіўшы толькі адно ачко, упэўнена занялі першае месца. У склад каманды ўваходзілі дацэнт ФПМІ А. А. Ягораў, вядучы навуковы супрацоўнік фізічнага факультэта А. П. Кузнечык і супрацоўнік фізфака А. Г. Рамаў, які ў 1997 годзе атрымаў званне майстра спорту міжнароднага класа.

Трэба адзначыць, што ў гэтым годзе каманда нашага універсітэта мае добрыя шанцы быць першай і напрыканцы спаборніцтваў. Таму ўсе жадаючыя могуць падтрымаць нашых выкладчыкаў, якія 16 сакавіка паспрабуюць перамагчы сапернікаў у басейне БДУ.

***Выпуск падрыхтавала Вольга КАЗДЗЕРКА***

СЛУЖБА 03

## "Я не хворы"



Прынята лічыць, што маладосць і здароўе — паняцці раўназначныя. Але праводзячы штогод аналіз стану здароўя студэнтаў першага курса па выніках медагляду, дактары прыходзяць да высновы, што абсалютна здаровых студэнтаў усяго каля 4-5 %, а 15 % студэнтаў маюць па 2-3 хранічныя захворванні.

Дзіўна арганізаваны чалавек — ён вельмі засмучаецца, калі губляе грошы, і абыякава ставіцца да таго, што па ўласнай віне губляе здароўе. Але ж як яго захаваць? Здароўе — гэта не толькі адсутнасць захворванняў, але і добры сон, апетыт, памяць, настрой. На 50 % яно залежыць ад ладу жыцця, на 20 % ад спадчыннасці, на 20 % ад экалагічнага становішча. Медыкі могуць паўплываць на наш стан здароўя толькі на 10 %.

Такім чынам, каб быць здаровым, перш за ўсё трэба прытрымлівацца здаровага ладу жыцця. Японцы, напрыклад, лічаць, нібы штодзённа трэба праходзіць пешшу 7 кіламетраў, з іх 20 хвілінаўісці шпарка. Штодзённы пад'ём па лесвіцы на пяты паверх значна скарачае рызыку ўзнікнення інфаркту міякарда.

У 70 % выпадкаў студэнты звяртаюцца да паслуг медыкаў у выпадку прастуднага захворвання. Гэта сведчыць перш за ўсё пра тое, што студэнты не надаюць неабходнай увагі загартоўванню. На трэцім месцы па значнасці для здароўя стаіць правільнае харчаванне. Прымаць ежу патрэбна 4 разы на дзень, уводзячы ў рацыён як мага больш прадуктаў расліннага паходжання. Асабліва актуальнай гэтая парада з'яўляецца для Беларусі. Калі ўмоўна вызначыць радыеактыўнасць 1 адзінкай, то ў зямлі яе 1 адз., у раслінных прадуктах — 10 адз., у жывёльных — 100 адз., а ў мясе дзікіх жывёлаў — 1000 адз. З прадуктаў жывёльнага паходжання менш за ўсё радыенуклідаў утрымлівае мяса курэй, індычкі, труса. Нябла га было б дадаць у рацыён прадукты з соі, марскую капусту.

Вялікае значэнне для захавання здароўя мае (асабліва для тых, хто займаецца разумовай працай, як, напрыклад, студэнты) валоданне аўтатрэнінгам. Не было б цяжкіх сітуацыяў, запушчаных хваравітых пачуванняў, калі б чалавек рацыянальна размяркоўваў разумовыя нагрузкі, прытрымліваўся правільнага распарадку дня, рэжыму працы і адпачынку. Вялікую сілу мае станоўчае самаўнушэнне. Даказана, што думка можа быць як стваральнай, так і разбуральнай. Падчас самаўнушэння важна не выкарыстоўваць часціцу "не". Скажам, калі неабходна ўнушыць сабе здароўе, трэба казаць самому сабе "Я здаровы" замест "Я не хворы".

*А. А. ФАМІНА, доктар 33-й гарадской паліклінікі*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана на паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" ВПП імя Я. Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны завул., 3*
*Ул. друк. арк. 1*
*Падпісана ў друк у 12.00*

12 САКАВІКА
Зак. 1432
Т. 1000 экз.
Бясплатна



*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*



**Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Крывадубскай А.*